УДК 82:398.91

***Б.А. Крук,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*УА “Мазырскі дзяржаўны педагагічны*
*ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна”,*
*Мазыр, Рэспубліка Беларусь*

# АБ ВЫХАВАННІ І РАЗВІЦЦІ АСОБАСНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ НАВУЧЭНЦАЎ ПРАЗ АСЭНСАВАННЕ ЛІТАРАТУРНЫХ ТВОРАЎ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАГА ЗМЕСТУ

*Анатацыя. У артыкуле разглядаюцца пытанні далучэння малодшых школьнікаў да нацыянальных традыцый і каштоўнасцей, выхавання і развіцця пачуцця асабістай адказнасці за дасягненне мэты, стараннасці ў вывучэнні роднай мовы, патрыятызму як важнейшай асобаснай маральнай якасці навучэнцаў.*
*Ключавыя словы: асобасная якасць, культуралагічны падыход, нацыянальна-культурны кампанент, патрыятызм.*

***B.A. Kruk,***
*PhD in Philology, Associate Professor*
*Mozyr State Pedagogical University named after I.P. Shamyakin*
*Mozyr, Republic of Belarus*



МГПУ им. И. П. Шамякина

# ON THE BUILDING AND DEVELOPMENT OF PUPILS' PERSONAL COMPETENCES BY MEANS OF INTERPRETING CULTUROLOGICAL LITERARY WORKS

*Abstract. The article deals with the problems of engagement of primary school pupils with national traditions and values, building and development of personal responsibility for the achievement of goals, diligence by native language studies, patriotism as most important moral quality of pupils.*

*Keywords: personal quality, culturelogical approach, national cultural component, patriotism.*

Асноўная роля ў забеспячэнні адзіных падыходаў да якасці пачатковай адукацыі належыць адукацыйнаму стандарту пачатковай адукацыі, які зацверджаны Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 26.12.2018 № 125 і абавязковы для прымянення ва ўсіх установах адукацыі, якія рэалізуюць праграму пачатковай адукацыі [1, с. 2]. Метадалагічнай асновай адукацыйнага стандарта з'яўляюцца сістэмна-дзейнасны, культуралагічны, асобасна-арыентаваны, кампетэнтнасны падыходы [1, с. 3]. Культуралагічны падыход як канцэптуальны ў дачыненні да літаратурнага чытання арыентуе настаўніка на арганізацыю адукацыйнага працэсу з устаноўкай "на дыялог культур, вывучэнне традыцый і каштоўнасцей, самабытнасці нацыянальнай культуры ў кантэксце сусветнай" [1, с. 4].

Вучэбная праграма па літаратурным чытанні ў кантэксце культуралагічнага падыходу падкрэслівае неабходнасць спасціжэння навучэнцамі "гістарычных, навукова-папулярных, вобразна-мастацкіх звестак пра Беларусь, яе прыроду, гісторыю, традыцыі, побыт, міфалогію і г. д." [2, с. 1]. У сувязі з гэтым урокі літаратуры на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі трэба разглядаць як асноўную крыніцу далучэння навучэнцаў да культуры, гісторыі беларусаў і як ключавое звяно ў спасціжэнні навучэнцамі бытавых і духоўных традыцый беларускага народа.

Паколькі актуальнай задачай сучаснай школы з'яўляецца неабходнасць далучэння вучняў да нацыянальных традыцый і каштоўнасцей, то на першы план выходзіць пытанне патрыятычнага выхавання. Адразу адзначым, што само слова "патрыёт" у літаральным перакладзе з грэчаскай мовы азначае "суайчыннік", а "патрыятызм" у прамым значэнні слова – гэта любоў да Айчыны. Д.І. Вадзінскі, напрыклад, характарызуючы праблему фарміравання маральных якасцей асобы, адзначае, што патрыятызм бывае розным і рознай бывае яго каштоўнасць, але галоўнай састаўной часткай патрыятызму, на думку вучонага, з'яўляецца гонар чалавека за сваю бацькаўшчыну, нацыянальны гонар, пачуццё нацыянальнай адказнасці [3, с. 74–75]. На фарміраванне асобы, падкрэслівае ў манаграфіі Д.І. Вадзінскі, уздзейнічае шэраг фактараў, але асаблівая роля належыць урокам літаратуры. У апошні час пераасэнсоўваецца змест літаратурнага чытання ў пачатковай школе. Шырока пададзены ў новых падручніках па літаратурным чытанні нацыянальна-культурны кампанент. Гэта творы пра гістарычнае мінулае Беларусі, пра нашых асветнікаў, пра быт, гаспадарку, характар і заняткі беларусаў, нацыянальныя скарбы і інш.

Цэнтральная ў сістэме літаратурнага чытання – тэма Радзімы. Яна пранізвае ўсю структуру літаратурнага чытання ў пачатковай школе. Аўтары новага дапаможніка па методыцы выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання падкрэсліваюць, што літаратурны матэрыял дае магчымасць "пазнаёміць вучняў з нацыянальна-культурнымі набыткамі беларускага народа, спасцігнуць яго шматвекавую культуру, далучыцца да багатай літаратурна-мастацкай спадчыны, сфарміраваць у вучняў пачуцці патрыятызму, нацыянальнай годнасці, павагі да самабытнасці свайго народа" [4, с. 84]. Ключавым у гэтым плане ў другім класе з'яўляецца раздзел "З любоўю да роднага краю", у трэцім класе –

МГПУ им. И.П. Шамякина

“Чалавек без Радзімы, што салавей без песні”, у чацвёртым класе – “Чалавек і Радзіма” [5; 6; 7; 8].

Паняцці “бацькаўшчына”, “радзіма” складаныя і шматгранныя. Яны фарміруюцца ў сістэме ўрокаў літаратуры. Асаблівая роля ў 4 класе належыць урокам літаратурнага чытання ў час вывучэння раздзела “Чалавек і Радзіма” [7, с. 55–82]. Калектыўная, арганізаваная настаўнікам, праца па малюнку да гэтага раздзела будзе больш эфектыўнай, калі на ўроку выкарыстаць некалькі малюнкаў розных краявідаў Беларусі, а затым прачытаць і зрабіць аналіз выказвання У. Караткевіча: *“Радзіма – гэта і сонца ў цябе над галавою, і паветра, якім дыхаем, гэта і вернасць твайго сябра, і мова, якую даў табе народ, і песня, што засталася ад прадзедаў”.*

На гэтым уроку трэба данесці да навучэнцаў думку аб тым, што сваю родную зямлю, сваю маленькую радзіму ёсць за што любіць, яе трэба любіць, ёю можна любавацца і захапляцца. Яна, як сонца, будзе асвятляць жыццёвую дарогу, яна, як родная мова і беларуская песня, даравана нам нашымі продкамі, дзядамі і прадзедамі.

Вучоныя-метадысты і настаўнікі-практыкі адзіныя ў думцы, што выхаванне патрыятызму прадугледжвае працу ў выхаванні любові да роднай прыроды, да мясцін, дзе нарадзіўся чалавек, бо менавіта з гэтага і пачынаецца патрыятызм. У кожнага вучня ў сістэме ўрокаў літаратурнага чытання патрэбна выхоўваць усведамленне таго, што найвышэйшы патрыятычны абавязак – гэта вучэбная дзейнасць на ўроках і дома, праца на карысць сям’і, горада (вёскі), на карысць сваёй Радзімы. Толькі так вучні могуць усвядоміць значэнне сваёй вучобы і паўсядзённай дзейнасці.

У малодшым школьным узросце інтэнсіўна развіваюцца розныя маральныя пачуцці, таму неабходна, каб школьнікі “глыбока разумелі вялікае грамадскае значэнне сваёй паўсядзённай дзейнасці, разглядалі яе як патрыятычную дзейнасць” [3, с. 76]. Малодшы школьны ўзрост – важны перыяд фарміравання асобы. У гэтым узросце развіваецца пачуццё асабістай адказнасці за дасягненне мэты *(раскажу лепш, прачытаю выразна, ведаю на памяць, напішу лепш і інш.).* Малодшыя школьнікі далучаюцца да духоўных здабыткаў праз прыналежнасць да сямейных, моўных, культурных і нацыянальных традыцый.

Развіццё культуры народа непасрэдна звязана з мовай, бо родная мова “ўдзельнічае” ў стварэнні нацыянальнай культуры. Быць патрыётам – значыць імкнуцца авалодаць сваёй роднай мовай. Гэтую думку яскрава транслююць сваім чытачам-пачаткоўцам многія пісьменнікі і паэты: М. Танк у вершы “Родная мова” (4 клас), М. Пазнякоў у вершы “Родная мова” (2 клас), М. Мятліцкі ў вершы “На мове роднай” (3 клас), Л. Дайнека ў вершы “Любіце мову” (4 клас), К. Цвірка ў вершы “У кнігарні” (4 клас), А. Вольскі ў казцы “Роднае слова”. Так, студэнты ў час педагагічнай практыкі на заключным этапе працы з вершам К. Цвіркі “У кнігарні” прапанавалі вучням 4 класа выбраць адзін з чатырох адказаў, якія дадзены ў вучэбным дапаможніку “Літаратурнае чытанне” [7, с. 95], і патлумачыць свой выбар. Даючы характарыстыку сыну, вучню перачытваюць адказ, які ён дае маці, і ацэньваюць учынкі сына. Вучні адказваюць на пытанне “*Што можна сказаць пра сына на аснове яго адказу?”.* Цікава, што 16 вучняў класа (80 %) выбралі чацвёрты варыянт адказу: сын па-сапраўднаму любіць сваю Радзіму. Цікава і тое, што яны патлумачылі свой выбар і іншымі пунктамі, што прапанаваны ў вучэбным дапаможніку: ён (сын) любіць сваю Радзіму, бо: а) вызначаецца начытанасцю; б) ён цікавіцца сучасным і гістарычным мінулым свайго народа;

МГПУ им. И. П. Шамякина

в) ён прыхільнік роднай беларускай мовы. Такія вывады вучняў сведчаць аб тым, што яны засвоілі галоўную думку верша К. Цвіркі.

Зразумець галоўную думку верша Леаніда Дайнекі “Любіце мову” [7, с. 96 – 97] дапаможа вучням калектыўная праца ў вызначэнні адносін аўтара да роднай мовы. Вучні адкажуць на пытанні: 1. Што гаворыць Леанід Дайнека ў вершы пра мову *(яна адна ў нас, як маці, яна “абсяг бароў былінных”, “мудрая душа”, “жыцця першааснова” і інш.).* 2. Чаму заканчвае аўтар свой верш пытаннем “Калі забудзем, згубім мову, Што скажам праўнукам сваім?” *(Ён запрашае свайго чытача паразважаць над гэтым пытаннем).* 3. Што трывожыць аўтара верша? *(Яго трывожыць тое, што родную мову – “мову доктара Скарыны, мову дзеда Талаша” – сталі забываць. Аўтара хвалюе і трывожыць тое, што так можна згубіць мову)*.

Вучні вызначаюць асноўную думку верша *(наш абавязак – вывучаць родную мову, захаваць яе для будучых пакаленняў, бо яна – “жыцця першаснова”).* Затым настаўнік прапануе вучням знайсці ў вершы, прачытаць і растлумачыць заклік аўтара: *“Любіце мову беларуску, Любіце з кожным днём мацней”*.

Такім чынам, сучаснае разуменне патрыятызму як асобаснай якасці характарызуецца неадназначнасцю тлумачэнняў і многаварыянтнасцю. Растлумачыць гэта можна складанай структурай гэтага паняцця і мнагапланавасцю форм праяўлення патрыятычных пачуццяў. У першую чаргу патрыятызм асацыіруецца і звязаны з Радзімай: роднымі мясцінамі, роднымі людзьмі, малой Радзімай і інш. Ён непарыўна звязаны з роднай мовай, бо ў ёй праяўляюцца адметныя рысы беларусаў.

Урокі літаратуры ў пачатковай школе – важнейшы сродак выхавання розных асобасных якасцей вучняў і патрыятычных пачуццяў у прыватнасці. Праз мастацкія творы малодшыя школьнікі пашыраюць веды пра родны край і свой народ, яго гісторыю і традыцыі. Важна, каб прывабны вобраз сваёй краіны, які навучэнцы ўсведамляюць праз мастацкія творы на ўроках і ў пазаўрочны час, знаходзіў падтрымку і ў асяроддзі бацькоў, бо дзеці транслююць адносіны, якія задаюць ім бацькі. Уменне супрацоўнічаць, прадуктыўная ўзаемная дзейнасць настаўнікаў, навучэнцаў і бацькоў – аснова патрыятычнага выхавання.

Вядома, што патрыятызм з’яўляецца і развіваецца як пачуццё, а праяўляецца ён у дзейнасці, ва ўчынках. Навучэнцы на ўроках літаратурнага чытання даюць ацэнку зместу твораў, аналізуюць і ацэньваюць учынкі герояў, характарызуюць пазіцыю аўтара – так яны далучаюцца да багатай гісторыі беларусаў, іх культуры і традыцый, імкнуцца стаць носьбітамі непаўторнай роднай мовы. Так яны ўсведамляюць сваю прыналежнасць да багатай гістарычнай, культурнай, нацыянальнай спадчыны Беларусі.

*Спіс крыніц*

1. Образовательный стандарт начального образования: Пост. Мин. обр. РБ от 26 декабря 2018 г. № 125 // Пачатковая школа. – 2019. – 16 с.

2. Учебные программы по учебным предметам для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания. Начальная школа. IV классы. – Минск : Нац. ин-т образов., 2018.– 212 с.

3. Вадзінскі, Д.І. Этыка-педагагічныя асновы маральнага фарміравання асобы: дапаможнік для аспірантаў / Д.І. Вадзінскі. – Мінск : Ратапрынт МДПІ імя А.М. Горкага, 1992. – 137 с.

4. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах : вучэбны дапаможнік / Н.М. Антановіч [і інш.]; пад рэд. М.Г. Яленскага. – Мінск : Вышэйшая школа, 2019 – 263 с.

МГПУ им. И.П. Шамякина